# Пленэр, фестываль, канцэрт




**22 мая ў Палацы Рэспублікі адбудзецца справаздачны канцэрт Магілёўскай вобласці, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Як паведамляе "К" намеснік начальніка ўпраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Святлана Казлова, у канцэрце будуць браць удзел паўтары тысячы мастацкіх калектываў і выканаўцаў, яшчэ звыш 800 творцаў зранку на Кастрычніцкай плошчы арганізуюць тэатралізаваную экспазіцыю, дзе будзе прэзентавана гісторыка-культурная спадчына вобласці.

Святочныя мерапрыемствы, такім чынам, распачнуцца ў 11 гадзін. Рэй на Кастрычніцкай плошчы будуць весці не толькі народныя майстры-шапавалы, глінамесы ды іншыя, але і артысты, якія распавядуць пра слаўную гісторыю краю, выбітных асоб. У дзеі прымуць удзел прадстаўнікі 21-га раёна вобласці, Магілёва і Бабруйска, а таксама члены нацыянальных суполак Магілёўшчыны.

У галерэі "Універсітэт культуры" распачне работу выстаўка твораў з фонду Абласнога мастацкага музея імя П.В. Масленікава пад назвай "Сучаснае мастацтва Магілёўшчыны".

У фае Палаца Рэспублікі будзе дзейнічаць выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дзе мяркуецца прадставіць работы ўдзельнікаў Міжнароднага жывапіснага пленэру "Вобраз радзімы ў выяўленчым мастацтве"...

Канцэртная праграма мае адмысловы дэвіз: "Суквецце талентаў фестывальнай Магілёўшчыны ў твой гонар, родная Беларусь!".

Як вядома, вобласць адметная унікальнымі і знакамітымі міжнароднымі фестывалямі: сямейнай творчасці "Сузор'е талентаў" — у Глуску, дзіцячага мастацтва "Залатая пчолка" — у Клімавічах, духоўнай музыкі "Магутны Божа" і эстраднай музыкі "Залаты шлягер" — у Магілёве, народнага мастацтва "Вянок дружбы" — у Бабруйску. Удзельнікі гэтых фэстаў і ўтвораць адну з сюжэтных ліній канцэртнай праграмы. У кожным блоку прымуць удзел ад 300 да 400 выканаўцаў.

Адрознай асаблівасцю канцэрта стане выразны акцэнт на творчасці не гарадоў, а сельскіх рэгіёнаў.

**Андрэй СТАРЖЫНСКІ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ